# Не адыйсці ад родных папялішчаў...

Адлік сваіх ваенных успамінаў вяду я ад страшнага дня 11 лютага 1943 года. Жылі мы ў вёсцы Верхняе Стунжава пад Сар'яй. Сабраліся аднойчы пайсці ў Вознава з воўнай — там партызаны стаялі, нават чохры ў іх былі.

Ноччу спалася дрэнна, штосьці трывожыла. Хаця мы тады наогул жылі насцярожана: прагрукочуць дзесьці калёсы, а мы, як бацька вучыў, — хавацца! Але на гэты раз было асаблівае прадчуванне. Мама мяне яшчэ суцяшала, маўляў, і ёй перад дарогай заўсёды сумна. А зранку выйшла, накінуўшы хустку, на ганак нас праводзіць, і сястра мая Рэня, пятнаццаці год, прытулілася да яе. І слёзы горкія нам услед, быццам у дальнюю дарогу адпраўляемся. Дасюль бачу іх абедзвюх на родным ганку, дасюль махае мне маці рукою.

Толькі адыйшлі ад вёскі — заціўкалі фантанчыкамі ў снезе кулі. Мы кінуліся ў ручаіну і пайшлі далей кустоўем. У Сар'ю нас партызаны прапусцілі, але забаранілі куды-небудзь далей ісці.

Зайшлі да брата Веры Жук, што ішла разам з намі. Праз гадзіну з боку Стунжава ўзвілося полымя. Гаспадар хаты залез на дах і, агледзеўшыся, пачаў запрагаць каня: «Будзем уцякаць!». Але заўпарціліся маці з жонкай — хто тады ведаў, што іх чакае? Разоў, мо, пяць кідаўся да каня, а потым бачым праз акно: ад Абразэева і Пушалат ідзе ланцуг фашыстаў у белых халатах. Яшчэ і самалёт прызямліўся, і адразу паўсюль поўна немцаў.

Усіх, хто знаходзіўся ў хаце, павялі да млына, што быў на ручаі. Да вечара нагналі шмат людзей. Ішлі цэлымі сем'ямі з Рашкшняў, з Мушына і іншых вёсак, неслі грудных дзяцей на руках.

Пачалі выбіраць маладзейшых. Як мы ні хаваліся за людзей, павыцягвалі нас з натоўпу чалавек дванаццаць, загналі ў спальню адной з хат, а ў прыхожай стол стаяў з гарэлкай ды ежай. Вартаваў нас латыш. «Не плачце, — кажа, — а то расстраляюць». І дае нам хлеба з маслам, ды яшчэ мёдам намазана. А ў нас у горле акамянела, і самі як здранцвелыя. Так і трымалі ў руках той хлеб.

А астатніх людзей павялі ўздоўж ручая, там сушылка стаяла без вокнаў, адны дзверы. Загналі туды людзей і дзверы замкнулі. Аўтаматчыкі залеглі паводдаль у снезе і давай страляць з усіх бакоў. Мусіць, запальнымі білі, бо хутка будыніна загарэлася. Людзі выскоквалі з агню і траплялі пад кулі. І крык стаяў на ўвесь свет, пакуль дах не абваліўся. Мы дрыжэлі і плакалі. Зразумелі, што і ў нашым Стунжаве тое самае адбылося. Потым ужо даведаліся пра сваіх. Усе нашы сем'і згарэлі. У Веры спалілі мужа і двух дзяцей. Бацька мой, пачуўшы стрэлы, бег за намі ўслед, упаў ля ручая — сэрца не вытрымала. З дзядзькавай сям'і сын кінуўся да лесу, расстралялі яго на бягу. Бацька кінуўся са схованкі — і таксама разрыў сэрца. Мусіць, чулыя сэрцы ў братоў былі... А астатнія пайшлі ў полымя.

Перавялі нас у другую хату, зачынілі на замок; вартавога паставілі. А потым сталі выводзіць па два-тры чалавекі. Куды — мы не ведалі, хаваліся адна за другую. Забралі і мяне. На двары былі груды бітых курэй, свіней, цялят. Загадалі курэй скубаць, а ў мяне рукі трасуцца, пальцы пёрца не могуць адарваць. І сэрца гарыць: што мне гэтыя куры, калі тата, мама, сястра... Хай лепш мяне заб'юць!

Убачылі, што толку з нас няма ў «тонкай» рабоце, прымусілі ваду ды дровы цягаць. Шлёпалі да цямна ў валёнках па макраце — адліга была. А потым гэтыя валёнкі да ног прымярзаць сталі, калі мы на гарышчы млына сядзелі — такі ў нас быў начлег. Усю ноч нечага чакалі. Раздасца ў гаі за рэчкай стрэл, а мы ўстрапянёмся: нашы, партызаны! Аднак ніхто ўжо нас не вызваліў.

А назаўтра ехалі мы на падводах з паліцэйскім канвоем па Росіцкаму бальшаку. Паўсюль дымілі галавешкамі былыя вёскі, там-сям блукала ўцалелая скаціна. Пад Росіцай стаялі самалёты. А людзей, нашых людзей, не было бачна.

Да людзей мы далучыліся ў касцёле, куды, зняўшы агромністы замок, упусціў нас вартавы. Чацвёра сутак праседзелі на каменнай падлозе. У разбітых вокнах гуляў вецер. Час ад часу дзверы адчыняліся, і да натоўпу перамёрзлых, галодных і сплаканых людзей далучаліся новыя партыі — большасцю жанчыны, старыя, дзеці. Есці не давалі, на двор не выпускалі. Вельмі хацелася піць. Бывала, што вартавы падаваў вады ў кансервавай бляшанцы.

**М. ЯРОХІНА,**
**жыхарка г. Верхнядзвінска.**

**(Заканчэнне будзе).**

# Не адыйсці ад родных папялішчаў...

**(Працяг. Пачатак у № 24 за 25 лютага).**

Былі сярод людзей і два ксяндзы — малады і стары. Словы суцяшэння не дзейнічалі, галава, сэрца, усё цела было запалонена непераходзячым болем.

На пятыя суткі пачалася сартыроўка па біблейскаму правілу: хто трапляў направа — таму жыць, налева — шлях у пекла. На розныя бакі калідора траплялі мацяркі і дзеці. Малыя з усёй сілачкі чапляліся за спадніцы матак, за іх ногі, рукі, шыі. Разлучалі іх сілком, па тры-чатыры фашысты на кожную чарговую пару.

А пасля ўсю левую шарэнгу пагналі на вуліцу. Праз некаторы час над возерам зашугаў знаёмы ўжо нам па Сар'і перадсмяротны хор, і жудаснае полымя асвятляла працэсію з падвод, на якіх везлі скамянелых ад жаху сірот. Мы ішлі пеша. Па ўсім шляху да Бігосава палалі кастрамі вёскі.

На станцыі нас загналі ў вагоны для жывёлы. Дзверы зачыніліся. «Бывай, Радзіма!» — зашчыміла ў сэрцы.

Везлі доўга. На адным з прыпынкаў латышы выносілі да эшалона прадукты, а мы плакалі наўзрыд, і хлеб здаваўся горкім. Ніякім чалавечым спачуваннем немагчыма нас было ўжо сагрэць.

У канцлагеры Саласпілс новыя баракі пахнулі смалой, было вельмі многа народу. Драцяная агароджа, вартавыя вышкі, нары ў тры рады — усё гэта стала нашым лютым «домам» на доўгія дні і ночы, пойла з рэдкім грубым капусным сцяблом, бульбінай у шалупінні і цэлым зернем — нашым «сталом». Да жыдкай «кавы», якую нам выдавалі раніцой, мы здагадаліся дадаваць солі, якой дзяліліся навічкі. Гэта давала адчуванне сытасці. А неўзабаве людзі сталі апухаць. Заўважыўшы гэта, фашысты выгналі нас з баракаў і адабралі апошні ласунак — соль. Змагаліся з сабою, зберагаючы той кавалачак хлеба, які давалі нам да кавы, аднак да «абеду» зберагчы не ўдавалася — голад дыктаваў сваё.

Вясной зноў прайшлі мы сартыроўку. Адбіраючы ад мацярок, дзецям вешалі на шыю апазнавальныя біркі. Немагчыма было глядзець на гэтыя расстанні. Жанчыны, ад якіх адбіралі дзяцей, ірвалі на сабе валасы, падалі ў непрытомнасці.

Нас, маладзейшых, размеркавалі па гаспадарках. Я трапіла ў Рыгу да немца Вольфа Рэйзэ ў якасці нянькі. Аднойчы яго жонка, полька Соня, паклікала мяне (эсэсавец Рэйзэ ўжо выехаў) і кажа: «Тут хутка будзе страшна. Ты не баішся?». «А мне ўжо няма чаго баяцца», — адказваю. «Будуць падаць бомбы». А я толькі гэтага і чакала.

Другая гаспадыня, прыехаўшы з Германіі з мужам-немцам, сама ж руская, была злоснай і жорсткай.

**М. ЯРОХІНА,**
**жыхарка г. Верхнядзвінска.**

**(Заканчэнне будзе).**

● **45 год Хатыні**

# Не адыйсці ад родных папялішчаў...

**(Заканчэнне. Пачатак у № 24 і № 26).**

Давялося мне паплакаць-пагараваць. Але ў нямецкай газеце, што ляжала на стале, неўзабаве ўбачыла па-руску: «Віцебская мясарубка». А потым, схітрыўшыся, падслухала з гаспадынінага пакою паведамленне па радыё: немцы адступаюць на Полацк. А назаўтра і сама яна заявіла мне: «Будзем збірацца. Паедзеш са мною». А я вырашыла: лепш у моры ўтаплюся.

Аднойчы, забраўшы з сабою старую маці і дачку, гаспадыня пакацiла на пляж, пакінуўшы мяне няньчыць малога ды рабіць усялякую работу. Зайшла я ў яе пакой, уключыла радыё — а там Масква паведамляе: Полацк узяты!

Думала я, думала — і знайшла, як мне здалося, выйсце, каб пазбавіцца нямецкага рабства. Пракруціла ў галаве ўвесь спектакль і як апраўдвацца буду — усё выходзіла як след. Растапіла пліту — вугаль добра гарэў — ды паставіла ванну, налiўшы вады. Кіпіць ужо вада ваўсю, бурбалкі ганяе, а я рукамі, як сляпая, рухі раблю. А потым — раз! — і апусціла іх у кіпецень.

Ачуняла на падлозе ад скразняку. Вада амаль уся выкіпела, рукі мае гарацъ, сэрца заходзіцца. Абматала я рукі пялёнкамі, ванну зняла, а тут і мая «фрау» наехала. Мяне не шкадавала, злавалася толькі, што абед не гатовы. А апраўдала мяне вышчэрбінка на пліце, якая быццам, і прывяла да няшчасця, калі я хацела мыць бялізну.

Аднак жа не адмовілася ад мяне мая мучыцелька! Нават у шпіталь вазіла лячыць. І рукі мае пачалі зажываць. Я была ў адчаі. Але зноў надумала. Усыпала ў ваду парашок пральны і давай свае рукі «адмочваць». Пайшлі пухіры, язвы. Апраўдацца было прасцей, а пакрычаць у падушку давялося. На гэты раз трапіла ў лазарэт і сваёй «фрау» ўжо не пабачыла болей.

Потым была я ў агульным лагеры, вазілі нас на франтавыя ўмацаванні, лес пілаваць і бярвенні цягаць на сабе прыйшлося. Парэпаныя губы, адзежа, змокшы, залубянее потым, голад... Але ўжо нашы самалёцікі спрабавалі цы гналі нас у падвал, лаяліся і пужалі: прыдуць рускія і вас павесяць, бо вы нам служылі. Паедзеце з намі! — Нізавошта! — Дык вас жа рускія расстраляюць! — А хай лепш рускія!

У кватэрах, дзе мы прыбіралі, паўсюль ляжалі ці віселі карты. Чырвоныя кружочкі на іх з кожным днём замыкаліся, прасоўваючыся на захад.

Потым у горадзе з'явіліся жалобныя флагі. На кухні ўжо варылі афіцэрам «гуляш» з каніны. А аднойчы забягае пажылы немец і крычыць: «Крыг аўс! Я больш не нямецкі зольдат, я рускі партызан!». На вуліцы ўжо калыхаліся белыя флагі і палотнішчы. У горадзе панавала паніка. Нам спешна загадалі закатваць у бляшанкі масла; гарохавы суп ім есці ўжо не было часу. Хтосьці (але не мы!) выплюхнуў яго з талеркі прама на партрэт Гітлера.

Нам казалі хавацца — а мы пайшлі на вуліцы. Забаранялі есці што-небудзь, каб не атруціцца — але ж ці даўно мы марылі трапіць на якую-небудзь ферму, каб свіной мяшанкі паесці!

Усёй сваёй «кухняй» — Лось Алена з Асвеі, Ніна з Полаччыны, полька з Пастаў і я — па прыкладу гараджан здабылі мяшок цукру, хлеб ды мех мукі. Муку ў нас па дарозе адабралі. Стаім ды плачам, аж чуем раптам парускy: «Почему плачете?» — Нашы!

Ад нашых мы ўжо не адчапіліся, праз ваенкамат і на радзіму трапілі. Вёска мая не адрадзілася, на Хатынскіх могілках знайшла прытулак.

Адзін яшчэ стунжаўскі хлопчык застаўся ў жывых. Пакуль немцы хадзілі па вёсцы, вылез ён праз акенца з той хаты, куды людзі былі сагнаны, ды яшчэ і дзверы адчыніў. Людзі не рашыліся разбягацца, не думалі ж нават аб агні, а хлапчынка, хаця і сем год яму толькі было, але скеміў, пабег у лес, наламаў лапніку, пераначаваў, схаваўшыся, у ямцы, ды пайшоў ад папялішча...

А я і дасюль да яго ў думках вяртаюся, да роднай хаты, да веснічак, да ганку, на якім стаяць мае маці і сястрычка, махаюць мне ўслед рукой.

Чаму я раней не спрабава-

...цягаць на сабе прыйшлося. Парэпаныя губы, адзежа, змокшы, залубянее потым, голад... Але ўжо нашы самалёцікі спрабавалі бамбіць Рыгу. Бывала, саскочым з платформы пад адхон і глядзім, як яны бомбы кідаюць.

Усё мацней грукатаў фронт, пацягнуліся машыны з раненымі фрыцамі. Па восені нас пагрузілі ў крытыя брызентам машыны і зноў павезлі. Праз прарэзаную лязом дзірачку ўбачылі, што вязуць цераз Даўгаву на захад. У ваду і на бераг падалі бомбы.

Апынуліся мы ў Лібаве. На параходы нас не грузілі — самім немцам месца не хапала. У порт бесперапынна ішлі калоны машын з нарабаваным багаццем. Але ж і нашы пра порт не забываліся! Назад машыны ішлі — толькі валасы ды кішкі на бартах.

Бамбяць — а мы бяжым на трэці ці чацвёрты паверх — адтуль далей бачна. Фры...ты, да веснічак, да ганку, на якім стаяць мае маці і сястрычка, махаюць мне ўслед рукой.

Чаму я раней не спрабавала ўцячы, знайсці дарогу на Радзіму?

Спачатку мы не жылі, былі нібы паралізаваныя, толькі што рухаліся ды дыхалі. Ды і бегчы было некуды, паўсюль была смерць.

Былі і ў Рызе нашы людзі. Лістоўкі расклейвалі, склад сярод белага дня падарвалі. Аднойчы афіцэр у нямецкай форме завёў з намі гаворку аб радзіме, назначыў яўку. Адна дзяўчына пайшла, апынулася потым у партызанскай зоне. А мы тады яшчэ нікому не давяралі, нікому не верылі. Ды і як можна было верыць, калі ў агні паміралі і немаўляты, і цяжарныя, і тыя, хто ўжо рыхтаваўся памерці сваёй смерцю?

І няўжо гэта было? 45 год...

**М. ЯРОХІНА,**
~~жыхарка г. Верхнядзвінска.~~ /Запісаў А. Бубала/